■ Героямі не сталі — героямі засталіся

«УСЮДЫ І ЗАЎСЁДЫ ЗАСТАВАЎСЯ АДВАЖНЫМ І СМЕЛЫМ БАЙЦОМ...»

1944-2014 70 гадоў вызвалення

Тыдзень таму «Звязда» пачала распавядаць пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія былі прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза, але атрымалі іншыя ўзнагароды. Размова перш за ўсё пра партызанаў, якія змагаліся за свабоду Радзімы ў тыле ворага. Кожны дзень у партызанскім атрадзе быў як подзвіг: нават проста выжыць у голадзе, холадзе, пад пастаяннымі фашысцкімі аблавамі і абстрэламі было складана... А гэтыя людзі пускалі пад адхон цягнікі, знішчалі цэлыя варожыя гарнізоны, не давалі фашыстам спакою ні днём, ні ўначы. Біяграфія кожнага з іх вартая таго, каб аб ёй напісаць. Героямі не сталі — героямі засталіся. У гісторыі незалежнай Беларусі, у народнай памяці. Гэта пра іх. Зрэшты, мяркуйце самі.

АСВЕЙСКІ ПАДРЫЎНІК

Рыгор Фёдаравіч Ганчароў.

Падрыўнік партызанскага атрада імя Арджанікідзэ Асвейскай брыгады імя Фрунзэ, якая дзейнічала ў Асвейскім, Расонскім, Дрысенскім раёнах Віцебскай вобласці.

Рыгор Ганчароў нарадзіўся ў 1924 годзе ў вёсцы Пусталёва Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці. Перад вайной працаваў на чыгуначнай станцыі ў Полацку. Падчас акупацыі знаходзіўся ў бацькоў, якія жылі недалёка ад станцыі Свольна.

Дапамагаў чырвонаармейцам, якія выходзілі з акружэння. Збіраў зброю, аказваў дапамогу прадуктамі харчавання і прадметамі першай неабходнасці партызанам. Калі за сям'ёй Ганчаровых пачалі сачыць, Рыгор са сваім малодшым братам 7 верасня 1942 года прыбыў у атрад, а праз некалькі дзён у атрад прыйшоў і іх бацька.

Малады баец хутка асвоіў ручны кулямёт, аўтамат і вінтоўку. Асаблівы інтарэс праявіў да падрыўной справы. Неўзабаве яго накіравалі ў падрыўную групу, і Рыгор пачаў выходзіць на баявыя заданні па дыверсіях на чыгунцы. На час падпісання ўзнагароднага ліста (люты 1944 года) Ганчароў пусціў пад адхон 14 варожых эшалонаў. У выніку крушэння саставаў разбіта 11 паравозаў, 110 вагонаў і платформаў з розным грузам.

Падчас правядзення аперацый на чыгунцы Рыгор Ганчароў двойчы трапляў у акружэнне, не раз нарываўся на засады ворага. Толькі дзякуючы цвярозаму разліку, уменню хутка ацаніць абстаноўку і прыняць правільнае рашэнне выходзіў са складанага становішча. «Усюды і заўсёды ён заставаўся адважным і смелым байцом», — так напісаў камандзір атрада ў прадстаўленні Ганчарова да звання Героя Савецкага Саюза.

Званне не было атрымана. Узнагародай за партызанскія подзвігі стаў ордэн Леніна, які ўручылі ў 1949 годзе.

БЫХАЎСКІ КУЛЯМЁТЧЫК

Васіль Пятровіч Крыўцоў.

Партызан 61-га партызанскага атрада, які дзейнічаў у Бялыніцкім, Клічаўскім, Магілёўскім, Шклоўскім, Быхаўскім і Кіраўскім раёнах Магілёўскай вобласці. Нарадзіўся ў 1918 годзе ў вёсцы Палом Клічаўскага раёна. У партызанах з мая 1942 года.

7 жніўня 1942 года група байцоў атрада (15 чалавек) пад камандаваннем лейтэнанта Я.Ф. Каўшырка выйшла на заданне ў раёне вёскі Кучын Быхаўскага раёна. Разграміўшы валасную нямецкую ўправу, група па дарозе назад спынілася ў невялічкім лесе. У гэты час гітлераўцы праводзілі карныя экспедыцыі. Па даносе правакатара фашысты даведаліся пра месцазнаходжанне партызанаў.

Раніцай 9 жніўня калона немцаў колькасцю да 1500 чалавек акружыла з усіх бакоў Кучынскі лес і шчыльным ланцугом пачала яго прачэсваць. Камандзір падраздзялення прыняў рашэнне змагацца да канца. Калі карнікі падышлі зусім блізка, партызаны сустрэлі іх ружэйна-кулямётным агнём. Праціўнік вымушаны быў адступіць, а затым зноў перайшоў да атакі. Партызаны вытрымалі і яе.

Асабліва ў гэтым баі вызначыўся кулямётчык Васіль Крыўцоў. Ад яго меткага агню засталіся на полі бою дзясяткі варожых салдат. Фашысты вымушаны былі выкарыстаць супраць адважных партызанаў мінамёты. Пасля абстрэлу партызанскай пазіцыі зноў перайшлі ў атаку. Няроўны бой доўжыўся больш як дзве гадзіны. Адзін за адным гінулі мужныя героі, неўзабаве змоўк і кулямёт Васіля Крыўцова... З пятнаццаці байцоў групы толькі двум удалося выратавацца. Праціўнік страціў 78 чалавек забітымі і больш за сотню параненымі.

23 жніўня 1944 года камандаванне атрада аформіла ўзнагародны ліст на прадстаўленне Васіля Крыўцова да звання Героя Савецкага Саюза. 28 жніўня ўзнагародны ліст падпісаў і камандзір Магілёўскай ваенна-аператыўнай групы К.М. Белавусаў. Толькі Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 30 снежня 1948 г. Васіль Крыўцоў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І-й ступені.

УШАЦКІ КАМІСАР

Іван Фёдаравіч Каранеўскі.

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці. Камісар атрада, з ліпеня 1942 года — партызанскай брыгады імя Чапаева, адначасова сакратар Ушацкага падпольнага райкама КП(б)Б.

Нарадзіўся Іван Каранеўскі ў 1905 годзе ў вёсцы Усвея Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці. Перад вайной — першы сакратар Гарадоцкага РК КП(б)Б. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны пакінуты ў тыле ворага. У пасёлку Ула пачаў наладжваць сувязі з насельніцтвам і рыхтаваць кадры для арганізацыі партызанскага атрада.

Восенню 1941 года Іван Каранеўскі быў арыштаваны немцамі. Аднак яму ўдалося ўцячы і прадоўжыць работу па арганізацыі партызанскай барацьбы. У маі 1942 года з групай падпольшчыкаў Каранеўскі ідзе ў лес, арганізуе партызанскі атрад і пачынае актыўную баявую дзейнасць. У чэрвені 1942 года атрад Каранеўскага ўвайшоў у склад партызанскай брыгады імя Чапаева, а сам камандзір атрада рашэннем Віцебскага абкама КП(б)Б зацвярджаецца камісарам гэтай брыгады і першым сакратаром Ушацкага падпольнага РК КП(б)Б.

З гэтага часу Каранеўскі вядзе актыўную работу сярод партызанаў і мясцовага насельніцтва па мабілізацыі ўсіх сіл на барацьбу з акупантамі, стварае новыя падпольныя групы і партызанскія атрады.

З кастрычніка 1942-га па красавік 1944-га партызаны цалкам ачысцілі тэрыторыю раёна ад фашысцкіх захопнікаў і ўстанавілі тут свой кантроль. Амаль два гады насельніцтва Ушацкага раёна знаходзілася пад абаронай партызанаў. Тут пачалі працаваць школы, бальніцы, праводзіліся пасяўныя кампаніі, уборка ўраджаю. З партызанскай зоны ў савецкі тыл было адпраўлена дзесяць тысяч бежанцаў, якія прыбылі ў партызанскі край з іншых акупаваных раёнаў. Уся гэта работа вялася пад непасрэдным кіраўніцтвам Івана Каранеўскага.

У маі 1944 года фашысты пачалі чарговую блакаду партызанаў Ушацкага раёна з прымяненнем авіяцыі, танкаў, адборных воінскіх часцей. Знаходзячыся ў першых шэрагах атакуючых байцоў, камісар брыгады Каранеўскі паказваў прыклад мужнасці і адвагі. У адным з такіх баёў бясстрашны патрыёт загінуў смерцю героя.

У 1945 годзе Віцебскі абкам КП(б)Б накіраваў хадайніцтва аб прысваенні Івану Каранеўскаму звання Героя Савецкага Саюза. Быў узнагароджаны толькі медалём «Партызану Айчыннай вайны» І-й ступені, ордэнам Чырвонага Сцяга. Яго іменем названы вуліцы ў гарадскім пасёлку Ула і райцэнтры Ушачы.

«БРЫГАДА ДЗЯДЗЬКІ ВАСІ»

Васіль Трафімавіч Варанянскі.

Ураджэнец Украіны, адзін з першых арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Міншчыне. 25 верасня 1941 года з ліку ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, якія выходзілі з акружэння, стварыў у Лагойскім раёне партызанскі атрад «Мсціўца», які неўзабаве сваімі баявымі дзеяннямі стаў вядомы не толькі акупантам, але і мясцоваму насельніцтву.

15 ліпеня 1942 года Васіль Варанянскі асабіста кіраваў боем супраць 700 нямецкіх карнікаў і паспяхова яго завяршыў. У лесе, недалёка ад вёскі Валянцінава, знаходзілася партызанская пляцоўка для прыёму грузаў, якія пачала дастаўляць з-за лініі фронту транспартная авіяцыя. Даведаўшыся пра гэта, гітлераўцы вырашылі ліквідаваць партызанскі «аэрадром» і накіравалі ў гэты раён карны атрад.

Партызанскі атрад Варанянскага заняў кругавую абарону і, падпусціўшы ворага на блізкую адлегласць, адкрыў агонь. Бой доўжыўся каля трох гадзін. У выніку фашысты страцілі каля сотні забітымі і вымушаны былі адысці. Захапіўшы варожыя трафеі, Варанянскі павёў атрад у Крайскія лясы.

У верасні 1942 года на базе атрада «Мсціўца» і іншых невялікіх атрадаў была створана магутная партызанская брыгада «Народныя мсціўцы», або, як яе яшчэ называлі, «брыгада дзядзькі Васі», камандзірам якой становіцца Васіль Варанянскі.

За перыяд яго камандавання брыгадай пушчаны пад адхон 51 эшалон, у баях і засадах забіта звыш тысячы нямецкіх салдат, праведзены аперацыі па разгроме варожых гарнізонаў у райцэнтры Мядзел, у пасёлку Ілья, у вёсцы Зарэчча і іншых населеных пунктах.

Васіль Варанянскі загінуў у верасні 1943 года ў авіякатастрофе, калі накіроўваўся ў Маскву па выкліку БШПР. Пасля смерці камандзіра брыгадзе «Народныя мсціўцы» было прысвоена імя Варанянскага. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 жніўня 1944 года Варанянскі пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

На жаль, кандыдатура Васіля Варанянскага, як і іншых заслужаных партызанаў Беларусі, была адхілена Цэнтральным Камітэтам КПСС у 1965 годзе падчас разгляду пытання аб прысваенні яму звання Героя Савецкага Саюза. Беларускі народ шануе памяць сваіх герояў: імя славутага партызанскага камандзіра носіць адна з вуліц Мінска.

Генадзь БАРКУН,
гісторык

■

■ На скрыжаванні лёсаў

УРОКІ ЖЫЦЦЯ АД ПРАДЗЕДАЎ

Нечаканы працяг атрымала гісторыя сям'і брастаўчан Кадаевых, пра якую наша газета расказала 7 жніўня 2010 года

Матэрыял называўся «Пад вянец — праз... 70 гадоў шлюбу!» Тады 94-гадовая Соф'я Васільеўна і 98-гадовы Уладзімір Арсеньевіч Кадаевы павянчаліся ў год 70-гадовага юбілею сумеснага жыцця. І гэта сапраўды прыгожая гісторыя. Скажу адразу, былыя юбіляры па-ранейшаму жывуць у сваёй кватэры на бульвары Касманаўтаў. Іх даглядае дачка Ларыса Уладзіміраўна.

Да гэтай пары памятаю доўгую грунтоўную гутарку з імі, аповед пра жыццё, якое не было лёгкім. Выпрабаванняў хапіла, але Соф'я і Уладзімір заўсёды вытрымлівалі іх годна. Родам яны са Смаленскай вобласці. Пасля заканчэння педагагічнага вучылішча трапілі працаваць у адну сельскую школу. Згоды сваёй каханай Уладзімір чакаў пяць гадоў. Пажаніліся маладыя настаўнікі ў 1940 годзе. А за два гады да гэтага арыштавалі бацьку Соні, дырэктара суседняй школы, і праз месяц расстралялі як ворага народа (Але пра лёс роднага чалавека і пасмяротную рэабілітацыю яны даведаюцца не скора...)

Пётр і Матрона Карпукі.

Перад самай вайной Уладзімір па накіраванні ваенкамата скончыў курсы шыфравальшчыкаў, атрымаў званне малодшага лейтэнанта і накіраванне на службу ў раён горада Высокае пад Брэстам. Маладыя забралі з сабой 6-гадовага брата Соф'і Валерыя, бо маці адной цяжка было справіцца з вялікай сям'ёй. Уладзімір усынавіў малалетняга сваяка, каб ураставаць яго ад кляйма сына ворага народа.

Соф'я Васільеўна ўладкавалася на працу настаўніцай. І ўсё ў іх было добра да чэрвеня 1941-га. Малады муж, зразумела, пайшоў з войскам. Яна засталася на сёмым месяцы цяжарнасці з малым братам на руках. Як перажылі вайну, пра гэта асобная размова. А пасля вайны, шчаслівыя тым, што франтавік вярнуўся жывы, перабраліся ў Брэст. Галава сям'і пайшоў працаваць на чыгунку, жонка — у школу.

Соф'я Кадаева любіла сваю работу, і работа ў яе заўсёды была на першым месцы. Яе былыя вучні і цяпер шлюць лісты любімай настаўніцы. А тады, пасля вайны, класы былі вялікія, сшыткаў многа, таму муж стараўся сустрэць жонку з працы, каб паднесці сумку. Дома шмат якія гаспадарчыя клопаты браў на сябе, каб яна як след падрыхтавалася да ўрокаў. Паднімаўся ён рана, паліў у печы, гатаваў сняданак, выпраўляў дзяцей у школу, каб жонка Сонечка магла добра выспацца і прыйсці ў клас бадзёрай. Ужо цяпер іх дачка Ларыса Уладзіміраўна гаворыць пра той перыяд, калі яны жылі ў кватэры прыватнага дома без выгод: «Тата ўзняў маму на такі п'едэстал, пра які толькі можа марыць жанчына. Маму нельга было расстройваць па дробязях,

Паднімаўся ён рана, паліў у печы, гатаваў сняданак, выпраўляў дзяцей у школу — каб жонка Сонечка магла добра выспацца і прыйсці на працу бадзёрай.

нават турбаваць без асаблівай прычыны. Усе нашы дзіцячыя праблемы вырашаў тата. І нам здавалася, што так і павінна быць, інакш не бывае. І маме так, напэўна, здавалася».

Дачка Ларыса цяпер, з пазіцыі вялікага жыццёвага вопыту, разважае аб тым, які прыклад жыццёвай мудрасці, чуласці, узаемапавагі, падтрымкі яны атрымалі ў спадчыну ад бацькоў. А брат Соф'і Васільеўны і адначасова прыёмны сын, які жыве ў Адэсе, напісаў у адным са сваіх лістоў: «Валодзя заўсёды быў і застаецца для мяне ўзорам ва ўсіх жыццёвых пытаннях». На прыкладзе прадзеда выхоўваўся і 21-гадовы праўнук Кадаевых, які, праўда, жыве са сваімі бацькамі ў Германіі. Ды паштовачку з добрым словам прыслаць прадзеду і прабабцы не забывае.

Але вернемся да самых цяжкіх гадоў жыцця былой настаўніцы — да гадоў акупацыі. Яна той перыяд да гэтай пары ўспамінае з непрыхаваным болем, відаць, што Соф'і Васільеўне нават цяжка расказваць аб перажытым. Былы гаспадар кватэры, як толькі прыйшлі немцы, адмовіў цяжарнай жанчыне з дзіцем у пакоі. Іх маглі расстраляць за тое, што яны сям'я афіцэра. Не шанавала новая ўлада і савецкіх спецыялістаў, якія прыехалі ў заходнія вобласці перад вайною і якіх называлі «ўсходнікамі». А тут — два ў адным. Вядома, вяскоўцы баяліся дапамагаць такім людзям. Таму блукалі Соня з малым ад вёскі да вёскі, ад падворка да падворка. І невядома, чым скончыліся б пошукі прыстанішча, каб не Пётр Карпук з вёскі Кавалікі, што за кіламетр ад Высокага. У яго доме

Уладзімір і Соф'я Кадаевы з першынцам.

на саломе з дапамогай вясковай павітухі і нарадзіла Соня сына. Пятра Васільевіча яна заўсёды ўспамінае як чалавека, якому абавязана жыццём...

А днямі ў карпункт газеты зайшоў студэнт Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Ігар Ляшук, расказаў, як збірае і запісвае гісторыю сваёй сям'і. Аказалася, што Ігар — прапраўнук таго самага Пятра Карпука! Вось яго аповед:

— Мая прабабка Надзея Пятроўна Ахрымук нарадзілася ў 1933 годзе ў вёсцы Кавалікі. Яе бацькі Пётр Васільевіч і Матрона Венядзіктаўна мелі невялікі дом і вялікую падсобную гаспадарку. Сваіх дзяцей змалку прывучалі да працы. Жылі дружна, шмат працавалі. У вёсцы іх паважалі. Прабабуля ўспамінае, што ў 1940 годзе ў вёску прыехала маладая сям'я Кадаевых. Яны знялі кватэру ў суседзяў Карпукоў. Соф'я Васільеўна працавала настаўніцай — у той час аўтарытэт педагога быў надзвычай вялікім. Але многа гора давялося перажыць настаўніцы, калі пачалася вайна. Нараджала яна ўжо ў доме бацькі Надзеі Пятроўны — Пятра Васільевіча. Васьмігадовая Надзя стала яе першай памочніцай. Калі трэба было, заставалася з малым Генам, нават варыла яму зацірку.

Шмат падзей за даўнасцю сцерліся з памяці прабабулі, але выпадак, які фактычна парадніў сем'і Кадаевых і Карпукоў, забыць немагчыма. Было гэта ў год вызвалення Беларусі. Вёску заняў атрад уласаўцаў. Паліцаі-здраднікі адчувалі свой непазбежны фінал і паводзілі сябе нахабна і агрэсіўна. Адзін з іх спыніўся на пастой у доме Карпукоў. І трэба ж — паклаў вока на маладую прывабную настаўніцу. Прымаць яго настойлівыя заляцанні Соф'я Васільеўна не магла, не ў яе правілах гэта было. Яна жыла думкамі і спадзяваннямі аб сустрэчы з мужам. Але ёй было страшна, і сваім горам яна магла падзяліцца толькі са сваімі выратавальнікамі. Пётр Карпук паабяцаў ёй нешта прыдумаць. І бліжэйшай ноччу вывеў жанчыну на хутар, за вёску, дзе была схованка. Там яна з дзецьмі і пераседзела небяспеку. Ранкам уласавец перавярнуў ледзь не ўвесь дом — шукаў Соф'ю па хлявах і клунях. І са злосці ссек усе вішні ў садзе гаспадара дома.

А Надзея Пятроўна Ахрымук і Соф'я Васільеўна Кадаева назаўсёды засталіся найлепшымі сяброўкамі. Цяпер, на жаль, па ўзросце і стане здароўя стасункі іх абмяжоўваюцца тэлефонам. Але яны рады чуць адна адну.

— Я вельмі ганаруся сваімі прапрадзедамі, прадзедамі, бабулямі, дзядулямі. Бо ўсе яны сумленныя працавітыя людзі, якія для нас з'яўляюцца ўзорам самых лепшых чалавечых якасцяў, — падсумаваў свой расказ Ігар Ляшук.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з архіва сям'і Ігара ЛЯШУКА

■

Мехколонна № 93

Учетный номер плательщика: 100003019. Вид экономической деятельности: общее строительство зданий.
Организационно-правовая форма: открытое акционерное общество. Единица измерения: млн руб.
Адрес: г. Минск, ул. Бабушкина, 13

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2014 года

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2013 года	На 31 декабря 2012 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	9 992	8 229
Нематериальные активы	120	1	-
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
В том числе: инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	76	189
Долгосрочные финансовые вложения	150	-	-
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**10 069**	**8 418**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	3 678	5 515
В том числе: материалы	211	3 678	5 002
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	-	513
готовая продукция и товары	214	-	-
товары отгруженные	215		
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	188	67
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240		
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	32 940	9 467
Краткосрочные финансовые вложения	260		
Денежные средства и их эквиваленты	270	308	1 717
Прочие краткосрочные активы	280	1	1
ИТОГО по разделу II	**290**	**37 115**	**16 767**
БАЛАНС	300	47 184	25 185
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	3 776	3 776
Неоплаченная часть уставного капитала	420		
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	-	-
Добавочный капитал	450	9 672	7 292
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	7 127	3 332
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**20 575**	**14 400**

Собственный капитал и обязательства	Код строки	На 31 декабря 2013 года	На 31 декабря 2012 года
1	2	3	4
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	70	
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**70**	**-**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	1 300
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	26 538	8 638
В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	15 449	6 474
по авансам полученным	632	5 352	700
по налогам и сборам	633	2 250	110
по социальному страхованию и обеспечению	634	579	299
по оплате труда	635	1 571	829
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	74	70
прочим кредиторам	638	1 263	156
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	1	-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	847
ИТОГО по разделу V	**690**	**26 539**	**10 785**
БАЛАНС	700	47 184	**25 185**

Руководитель **С.Г. Супранович**

Главный бухгалтер **О.В. Баранова**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2013 года

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2013 года	За январь–декабрь 2012 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	59 647	38 078
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(46 796)	(31 928)
Валовая прибыль (010 – 020)	030	12 851	6 150
Управленческие расходы	040	(7 121)	(5 846)
Расходы на реализацию	050	-	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	5 730	304
Прочие доходы по текущей деятельности	070	8 626	9 534
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(8 511)	(9 429)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	5 845	409
Доходы по инвестиционной деятельности	100	833	220
В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	810	126
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	23	94
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104		-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(117)	(25)
В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(117)	(25)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	-	-
Доходы по финансовой деятельности	120	-	-
В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	-	-
прочие доходы по финансовой деятельности	122	-	-
Расходы по финансовой деятельности	130	(139)	(15)
В том числе: проценты к уплате	131	(139)	(15)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	-	-
прочие расходы по финансовой деятельности	133	-	-
Иные доходы и расходы	140	-	-
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140)	150	577	180
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 150)	160	6 422	589
Налог на прибыль	170	(1 164)	(111)
Изменение отложенных налоговых активов	180	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	190	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(44)	
Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200)	210	5 214	478
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	1 587	2 067
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	6 801	2 545
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ЗАСТРОЙЩИКА от 12.04.2014 г.

Сведения о застройщике:
Белорусско-английское Совместное закрытое акционерное общество «ЛадаГарант» (СЗАО «ЛадаГарант»). СЗАО «ЛадаГарант» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС – Холдинг» ЗАО).

Местонахождение: г. Минск, ул. Щорса, 1А, пом. 15.

Режим работы: рабочие дни – с понедельника по пятницу – рабочие часы – с 8.30 до 17.30, обед – с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Данные о государственной регистрации: зарегистрировано Министерством иностранных дел Республики Беларусь в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №100934617.

Сведения о проектах жилых домов, введенных в эксплуатацию за последние 5 лет:
1. 9-этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом № 91 по ул. Грушевская в г. Минске;
2. 15-17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом № 15 по ул. Маяковского в г. Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки;
3. 7-этажный 5-секционный 135-квартирный жилой дом № 3 по ул. Щорса;
4. 15-этажный односекционный 89-квартирный жилой дом № 8 по ул. Щорса 3-я;
5. 9-этажный 4-секционный 135-квартирный жилой дом № 1 по ул. Щорса;
6. 10-этажный 7-секционный 261-квартирный жилой дом № 44 по ул. Железнодорожная;
7. 13-этажный 6-секционный 426-квартирный жилой дом № 23 по пр. Дзержинского (I-пусковой комплекс (4-секции)).

Цель проекта – строительство панельного дома, в том числе 25% площади для сотрудников органов МЧС, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по направлению Минского городского управления МЧС, серии М 464М-16 в составе объекта «Многоэтажные жилые дома с объектами административно-общественного назначения в квартале жилой застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожной – ул. Щорса. VII этап». Жилой дом № 21 по генплану.

Сведения о сроках реализации
Начало строительства – 10 декабря 2013 г.
Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию декабрь 2014 г.

У Застройщика имеются:
- решение Мингорисполкома №1981 от 08.08.2013 г. « Об изъятии, предоставлении, продлении срока аренды земельных участков, разрешении строительства и внесении изменения в решение Мингорисполкома»;
- свидетельство (удостоверение) № 500/1032-8250 от 23.09.2013 г. о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000005006590, расположенный по адресу: г. Минск в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса, площадью 0,5498 га;
- свидетельство (удостоверение) № 500/1032-8249 от 23.09.2013 г. о государственной регистрации на право постоянного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000005006589, расположенный по адресу: г. Минск в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса, площадью 0,0097 га;
- свидетельство (удостоверение) № 500/1032-8248 от 23.09.2013 г. о государственной регистрации на право постоянного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000005006588, расположенный по адресу: г. Минск в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса, площадью 0,0110 га;
- свидетельство (удостоверение) № 500/1032-8247 от 23.09.2013 г. о государственной регистрации на право постоянного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000005006587, расположенный по адресу: г. Минск в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса, площадью 0,1588 га;
- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» (заключение от 27.09.2013 г. №849-15/13;
- разрешение на производство строительно-монтажных работ от 16.12.2013 г. № 2-208Ж-075/13.
- договор строительного подряда с ОАО «МАПИД» № 1-13 от 29.10.2013 г.

Местонахождение строящегося объекта: г. Минск, пересечение ул. Щорса – ул. Папанина, в квартале застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса.

Характеристика объекта: Объект – 127-квартирный, 16-этажный крупнопанельный жилой дом серии М464М-16. Площадь жилого здания – 11 228,44 кв.м. Общая площадь квартир 9208,53 кв.м. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, нуждающимися в улучшении жилищных условий, строятся с выполнением в полном объеме отделочных, сантехнических и электро-технических работ, предусмотренных проектно-сметной документацией.

Стены: наружные – железобетонные панели, внутриквартирные – из блоков ячеистого бетона и из железобетона.

Перекрытия – железобетонные.

Остекление лоджий – по СТБ 1912 из профилей ПВХ.

Двери – деревянные по СТБ 1138, СТБ 1647, СТБ 1394;

Сантехническое оборудование – унитаз, ванна, раковина, счетчики холодной и горячей воды.

Электрическое освещение – распределительная и групповая сеть.

Отопление – центральное.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1 кв.м общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по направлению Минского городского управления МЧС:
- с государственной поддержкой – 11 537 500 белорусских рублей,
- для площади, превышающей нормативную площадь, при строительстве с государственной поддержкой – 15 345 000 белорусских рублей.

Элементы благоустройства: создаются площадки для отдыха, занятия спортом, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому – асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка.

Общее имущество дольщиков – межквартирные лестничные клетки, лестницы, коридоры, крыша, техподполье, несущие, ограждающие конструкции, оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы благоустройства и озеленения.

Прием заявлений от граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, по направлению Минского городского управления МЧС, осуществляется отделом маркетинга и правового обеспечения сделок с недвижимостью ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник – пятница с 8.30 до 17.30, обед с 13.00 до 14.00. Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт. Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение трех календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и СЗАО «ЛадаГарант» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

Условия ознакомления с информацией по проекту: по тел. 8-017 219-78-22, VELCOM 8-029 679-34-24; на сайте http://www.lada.by/, либо по адресу: ул. Щорса, д. 1А, пом. 15.

10.04.2014 г.

Застройщик
СЗАО «ЛадаГарант» Ваганов А.В.